■ Парламенцкі дзённік

Аўстрыя высока цэніць міратворчую палітыку нашай краіны

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з аўстрыйскім парламентарыем

Наша краіна заўсёды выступала і выступае за раўнапраўныя адносіны з усімі дзяржавамі. Пра гэта заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з Карлхайнцам Копфам, першым намеснікам старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыйскай Рэспублікі.

— Падчас сустрэчы з Прэзідэнтам вы шмат гаварылі пра развіццё нашых эканамічных стасункаў, — адзначыў спікер. — Думаю, у нас таксама ёсць велізарны патэнцыял супрацоўніцтва ў галіне навукі, культуры, адукацыі, медыцыны, спорту і турызму.

Кажучы пра міжпарламенцкія кантакты Уладзімір Андрэйчанка выказаў спадзяванні, што яны будуць развівацца больш актыўна.

У сваю чаргу Карлхайнц Копф заявіў: «Мы вельмі высока цэнім намаганні кіраўніцтва Беларусі і, перш за ўсё, Прэзідэнта Беларусі па дасягненні прагрэсу ва ўрэгуляванні ўкраінскай праблемы». Ён дадаў, што такой думкі прытрымліваецца і Еўрасаюз у цэлым.

— Беларусь з'яўляецца краінай, стабільнай не толькі з пункту гледжання ўнутранай палітыкі, яна прыкладае намаганні для таго, каб стабілізаваць сітуацыю ў рэгіёне. Можам з упэўненасцю сказаць, што Беларусь з'яўляецца донарам стабільнасці ў рэгіянальным кантэксце.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■

■ Дыялог бізнесаў

На адной дзелавой мове

На Другім Расійска-Беларуска-Аўстрыйскім форуме перспектывы супрацоўніцтва і магчымыя кантракты абмяркоўвалі каля ста прадпрыемстваў і арганізацый з трох краін.

Сфера энергетыкі

Як заявіў **першы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Аляксандр НАХАЕНКА,** самы буйны кантракт, які плануецца падпісаць на бізнес-форуме, складзе 300 млн долараў у сферы энергетыкі. Ён таксама падкрэсліў, што Беларусь супрацоўнічае з Аўстрыяй у розных галінах — ад сельскай гаспадаркі да высокіх тэхналогій, тэхнікі, інфарматыкі, электронікі, энергетыкі. Паводле таго, як размеркаваліся ўдзельнікі форуму па рабочых секцыях, можна адзначыць, што найбольшая колькасць удзельнікаў падалі заяўку на секцыю «Энергетыка, інфраструктура і лагістыка» — каля 120 кампаній з трох краін. Будуць працаваць яшчэ дзве секцыі: «Сельская гаспадарка і прадукты харчавання» і «ЕС-ЕАЭС: перспектывы ўзаемадзеяння бізнес-асацыяцый у рамках еўрапейскіх і еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў». Падчас сустрэчы павінны адбыцца індывідуальныя перамовы паміж бізнесменамі Аўстрыі, Беларусі і Расіі.

Штуршок развіццю

Прэзідэнт Палаты эканомікі Аўстрыі Крыстаф ЛЯЙТЛ надае Беларусі ролю моста паміж буйнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі ЕС і ЕАЭС. Паводле яго слоў, дыялог, які вядзецца тут, здольны ствараць неабходныя ўмовы функцыянавання эканомік.

«Такім чынам ЕС і ЕАЭС сапраўды могуць стаць бліжэй. І менавіта гэты трохбаковы форум дае ўсяму штуршок», — адзначыў Крыстаф Ляйтл.

Сучасная Аўстрыя мае багаты вопыт развіцця ў сферах энергетыкі, аховы здароўя, электронікі, машынабудавання. І, паводле яго слоў, аўстрыйскі бок знаходзіцца на форуме якраз для таго, каб знайсці кааперацыйныя сувязі з кампаніямі, што маглі б сумесна працаваць у гэтых сферах.

Акрамя таго, паводле слоў **дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора РАПОТЫ,** Аўстрыя адкрытая да дыялогу і з'яўляецца адным з актыўных інвестараў у эканоміку як Беларусі, так і Расіі.

«Аўстрыйскіх бізнесменаў не трэба ўгаворваць. Яны зацікаўлены ў тым, каб з'явіўся яшчэ адзін інстытут. Хочацца верыць, што гэты форум будзе пастаянна дзейным механізмам узаемадзеяння яшчэ і не толькі з Аўстрыяй», — адзначыў Рыгор Рапота.

На думку Рыгора Рапоты, правядзенне такога мерапрыемства — вялікая карысць для Беларусі і Расіі, таму што гэта яшчэ адзін канал дыялогу з аўстрыйскімі бізнесменамі. «У нас іх некалькі, і мы стараемся іх падтрымліваць».

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

■

Электраэнергія для прадпрыемстваў і налета даражэць не будзе

А тарыфы для насельніцтва плануюць карэктаваць толькі ў цеснай звязцы з павелічэннем даходаў

Аб гэтым паведаміў учора на ўрачыстым адкрыцці XX Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК.

Міністр адзначыў, што ўжо на працягу трох гадоў тарыфы на электраэнергію для рэальнага сектара эканомікі ўвесь час толькі памяншаюцца. Больш за тое, Уладзімір Патупчык запэўніў, што гэтыя тарыфы застаюцца даволі стабільнымі, а для рэальнага сектара эканомікі іх не плануецца павялічваць нават на 2016 год. Разам з тым, кіраўнік галіны паведаміў, што цяпер спецыялісты пралічваюць у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, як гэтыя тарыфы будуць змяняцца ў сярэдне- і кароткатэрміновай перспектыве. «Гэты працэс не з'яўляецца статычным, таму, безумоўна, для таго каб мы не адставалі ад тых працэсаў, якія адбываюцца ў макраэканоміцы, тарыфы на электрычнасць для насельніцтва будуць павялічвацца, але яны будуць абавязкова ўвязаны з узроўнем даходаў нашых людзей», — удакладніў пазіцыю міністэрства Уладзімір Патупчык.

Павышэнне энергаэфектыўнасці прадпрыемстваў энергетыкі ўжо сёння дае свае станоўчыя вынікі. Паводле слоў Уладзіміра Патупчыка, пачынаючы з наступнага года галіна пачне эканоміць для краіны штогод каля 200 млн долараў. А яшчэ міністр паведаміў, што назапашаны за кошт рэалізацыі дзяржпраграм 2006—2014 гадоў эфект склаў ужо каля 600 млн долараў. «Такім чынам мы ўносім свой уклад у стабільнасць на валютным рынку і павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі ў цэлым», — дадаў ён.

Нагадаем, што XX Беларускі энергетычны і экалагічны форум праходзіць у Мінску з 13 па 16 кастрычніка. Яго ўдзельнікаў чакае насычаная дзелавая праграма, якая аб'ядноўвае 20 мерапрыемстваў. У рамках форуму адбудуцца і сумесныя мерапрыемствы ў межах 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі, якая праходзіць у Мінску з 5 па 16 кастрычніка.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Меркаванне

АБГРУНТАВАНЫЯ ЧАКАННІ

Другі Расійска-Беларуска-Аўстрыйскі форум, які праходзіць у Мінску ў гэтыя дні, з'яўляецца важным фарматам міжнародных зносін ва ўмовах з'яўлення ў Еўропе розных інтэграцыйных фарматаў, перш за ўсё еўрапейскага і еўразійскага. Вядома, камусьці можа падасца незвычайным падбор удзельнікаў — партнёрамі па форуме велізарнай Расіі выступаюць Беларусь, якая ўваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз, і Аўстрыя (Еўрапейскі саюз), але менавіта ў гэтым і сэнс мерапрыемства — знайсці падставы для супрацоўніцтва, а не процістаяння ЕС і ЕАЭС.

Асабліва гэта важна ў цяперашняй сітуацыі, калі ў Еўропе фактычна складваецца абстаноўка часоў «халоднай вайны» паміж Расіяй і ЕС, а ўзаемныя санкцыі замяняюць сабой нармальныя формы дыялогу. Роля Беларусі ў развіцці кааперацыі еўразійскага і еўрапейскага інтэграцыйных праектаў удала сфармуляваў прэзідэнт Палаты эканомікі Аўстрыі Крыстаф Ляйтл, удзельнік форуму. На яго думку, «роля Беларусі — роля сувязнога звяна, свайго роду моста паміж ЕС і ЕАЭС, паміж гэтымі буйнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, каб ствараць стабільныя ўмовы функцыянавання эканомік, каб ЕС і ЕАЭС сапраўды станавіліся бліжэй».

Нагадаем, што першы трохбаковы эканамічны форум Беларусі, Расіі і Аўстрыі прайшоў 14 лістапада 2014 года ў Вене. Асноўнымі яго ўдзельнікамі былі прадстаўнікі буйнога бізнесу з усіх трох краін, а ўсяго ў яго рабоце прыняло ўдзел 170 прадпрыемстваў і арганізацый. Парадак дня ўключаў пытанні развіцця гандлёвага, вытворчага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва краін-удзельніц.

Падчас цяперашняга форуму спектр пытанняў стаў больш спецыялізаваным, ахапіўшы найбольш важныя сферы. Асаблівая ўвага надаецца энергетыцы, інфраструктуры і лагістыцы, сельскай гаспадарцы і вытворчасці прадуктаў харчавання. Немалаважныя для ўдзельнікаў форуму і перспектывы ўзаемадзеяння бізнес-асацыяцый трох краін-удзельніц.

Вядома, ёсць цікавасць і да іншых патэнцыйных сфер супрацоўніцтва. У аўстрыйскіх прадпрыемстваў ёсць вялікі аўтарытэт і ў такіх галінах бізнесу, як ахова здароўя, электроніка і машынабудаванне, што цікава для Беларусі і Расіі з прычыны мадэрнізацыі эканомікі.

Важна памятаць і пра тое, што Аўстрыя, нягледзячы на адносна невялікую колькасць насельніцтва, супастаўную з беларускім, з'яўляецца буйным фінансавым цэнтрам Еўропы. Гэта звязана з імперскімі часамі, калі ў Вену, былую сталіцу спачатку Аўстрыйскай, а потым Аўстра-Венгерскай імперыі, сцякаліся велізарныя фінансавыя патокі з правінцыі. Пасля краху Аўстра-Венгерскай імперыі банкі з назапашанымі раней актывамі працягнулі паспяхова развівацца, адыгрываючы ўсё больш важную ролю ў фінансавай сістэме Еўропы.

Тое, што ў наступным годзе пройдзе і трэці форум, хутчэй за ўсё ў Расіі, не выклікае пытанняў. Гэтаму спрыяе як пазітыўная атмасфера правядзення мерапрыемства, якая абяцае рэалізацыю сур'ёзных праектаў з высокай нормай прыбытку яго ўдзельнікам, так і падбор арганізатараў. Мерапрыемствы арганізаваны Федэральнай Палатай эканомікі Аўстрыі, Беларускай і Расійскай гандлёва-прамысловымі палатамі, а гэта найважнейшыя праваднікі інтарэсаў нацыянальнага бізнесу ў сваіх краінах. Прыемна адзначыць і сур'ёзную падтрымку ў арганізацыі форуму з боку знешнепалітычных міністэрстваў усіх трох краін.

Ёсць падставы для значных пазітыўных перамен нашых адносін з ЕС. Еўрасаюз занадта доўга незаслужана сурова ставіўся да нашай краіны. А ва ўмовах, калі Беларусь набыла важнае геапалітычнае значэнне не толькі як мост паміж ЕС і ЕАЭС, але і як вельмі значная ва ўрэгуляванні ўкраінскага крызісу дзяржава, дрэнныя адносіны з Беларуссю цалкам супярэчаць нацыянальнай бяспецы краін ЕС. Ва ўмовах новых адносін, прызначаных нівеліраваць ранейшыя праблемы, узнікае шмат магчымасцяў для кааперацыі. Прыемна, што аднымі з першых імі спяшаюцца скарыстацца менавіта аўстрыйскія і расійскія бізнесмены, з якімі ў беларускіх прадпрыемстваў існуе доўгая гісторыя супрацоўніцтва.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

АБСЕ ацаніла выбары

належным чынам, лічыць Лідзія Ярмошына

«Магу сказаць, што Цэнтральная камісія задаволена тым заключэннем, якое прадстаўлена па выніках назірання за выбарамі з боку місіі АБСЕ», — заявіла Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Паводле слоў Лідзіі Міхайлаўны, учора адбылася яе сустрэча з кіраўнікамі місіі АБСЕ, бо ў той спыняюцца паўнамоцтвы маніторынгавай місіі і неўзабаве яны пакінуць Мінск. «Падчас сустрэчы мы абмяняліся ўражаннямі ў дачыненні да працэсу назірання і працэсу выбараў і, у прынцыпе, намецілі перспектывы працы на будучыню. Я падзякавала супрацоўнікам місіі, яе кіраўніцтву за спробу бачання аб'ектыўнасці тых падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне», — пракаментавала сустрэчу старшыня ЦВК.

Яна адзначыла станоўчую тэндэнцыю ацэнкі місіяй беларускіх выбараў: «За доўгія гады міжнароднага назірання менавіта з боку місіі АБСЕ ў нашай краіне мы ўпершыню атрымалі справаздачу, якая змяшчае высновы і пералічвае падзеі не толькі з адмоўнага боку, але і адзначае шмат станоўчага». І дадала: «Гэтым трэба ганарыцца».

«Быў адзначаны як вельмі добры працэс галасавання на 95% участкаў, дзе былі міжнародныя назіральнікі. Хацела б падкрэсліць, што гэта вельмі высокая ацэнка менавіта працэдуры галасавання. Так, былі адзначаны недахопы, звязаныя з празрыстасцю, дакладнасцю працы ўчастковых выбарчых камісій у момант падліку галасоў. Тым не менш колькасць выпадкаў, дзе члены місіі выказалі заўвагі, зменшылася ў параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2012 года», — паведаміла Лідзія Ярмошына. Яна падкрэсліла, што «члены місіі АБСЕ стараліся працаваць аб'ектыўна». На думку старшыні ЦВК, у гэтым ёсць заслуга і саміх беларусаў. «Нашы арганізатары выбараў на месцах усямерна прыклалі намаганні да таго, каб працэдура выбараў была максімальна адкрытай, падлік галасоў сумленным, а назіральнікі сапраўды зрабілі свае аб'ектыўныя заключэнні», — сказала яна.

Лідзія Міхайлаўна звярнула ўвагу на тыя станоўчыя моманты, якія канстатавала місія. Паводле яе слоў, гэта абстаноўка, якая была ў краіне напярэдадні выбараў, добразычлівасць і адкрытасць усіх членаў выбарчых камісій, іх супрацоўніцтва з членамі місіі, а таксама выдатная праца сродкаў масавай інфармацыі, якія без цэнзуры прадстаўлялі магчымасць вядзення перадвыбарнай агітацыі кандыдатам у прэзідэнты. Акрамя таго, у заключэнні гаворыцца, што агітацыйная кампанія ў апошнія два тыдні праводзілася кандыдатамі на добрым узроўні, чаму ўсяляк спрыялі мясцовыя ўлады.

КАМПЕТЭНТНА

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі Яўген ЧУРАЎ, які знаходзіўся ў Беларусі падчас выбараў у якасці міжнароднага назіральніка, наступным чынам пракаментаваў папярэднія вынікі выбараў:

— Хацеў бы звярнуць увагу на два важныя факты, якія, з аднаго боку, пацвярджаюць наяўнасць у Рэспубліцы Беларусь апазіцыйных настрояў, з іншага боку, яны пацвярджаюць сумленнасць праведзеных выбараў. Першае: графа — «супраць усіх». 7% — гэта нямала. І другое: вынікі галасавання ў Мінску, якія кантрасна адрозніваюцца ад галасавання ў цэлым па краіне. Прытым, што і вынікі галасавання ў цэлым па краіне былі зразумелыя для палітолагаў загадзя, гэтаксама былі зразумелыя для палітолагаў, як беларускіх, так і замежных, вынікі галасавання па Мінску. Агучаныя ў ноч на панядзелак звесткі пацвярджаюць сумленнасць падліку галасоў на гэтых выбарах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*
Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПЛАНЫ ЭКС-КАНДЫДАТАЎ

Падводзяць вынікі выбараў і тыя, хто ўдзельнічаў у барацьбе за прэзідэнцкае крэсла. Прынамсі, ужо экс-кандыдаты падзяліліся з журналістамі сваімі планамі на будучыню.

Лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Сяргей Гайдукевіч цалкам згодны з усімі агучанымі ЦВК лічбамі. Палітык дадаў, што Беларусь будзе і далей развівацца спакойна, без узрушэнняў.

— Са свайго боку я асабіста і партыя плячо падставім у гэты складаны час. Калі спатрэбіцца, пойдзем туды, куды Радзіма скажа, — паабяцаў Сяргей Гайдукевіч.

У пацвярджэнне гэтых слоў кіраўнік ЛДПБ паведаміў, што ўжо ў лістападзе яго партыя пачынае парламенцкую кампанію.

Таццяна Караткевіч расказала, што не завяршае сваю палітычную дзейнасць і плануе працягнуць яе падчас найбліжэйшых парламенцкіх выбараў. На пытанне: «Ці будзеце вы балатавацца падчас парламенцкіх выбараў?» Таццяна Караткевіч адказала: «Так, буду».

«Трэба прызнаць, што шмат людзей падтрымлівае дзейную ўладу», — сказала экс-кандыдат у Прэзідэнты.

Мікалай Улаховіч прызнае вынікі прэзідэнцкай кампаніі 2015 года і лічыць, што дзейны кіраўнік дзяржавы з вялікім адрывам апярэдзіў іншых кандыдатаў заслужана. Пры гэтым ён заявіў аб намеры зрабіць Беларускую патрыятычную партыю, якую ён узначальвае, значнай сілай у беларускім грамадстве. «Мы, напэўна, няправільна рабілі акцэнт. Пераглядзім свой статут, у нас з'явіліся маладыя новыя сілы, і я думаю, што і Сяргей Гайдукевіч пазайздросціць маім хлопцам, якія будуць займацца партыйнай дзейнасцю», — сказаў Мікалай Улаховіч, маючы на ўвазе лідара ЛДПБ і свайго канкурэнта на выбарах.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Святло ў акне

ЛЮБОВІ ХАПАЕ НА ЎСІХ

Яна не вымяраецца запісам у пашпарце

20 шматдзетных маці атрымалі высокую ўзнагароду — ордэн Маці — з рук старшыні Мінскага абласнога камітэта Сямёна Шапіры. Адной з іх стала Любоў Чагіна, маці пяці ўласных дзяцей, і шасці прыёмных.
Вялікая сям'я Чагіных жыве ў пасёлку Крынічны ў дзіцячай вёсцы «Вытокі». Іх трохпавярховы катэдж абкружаны сасновым борам. У двары растуць ружы і пахне грыбамі... А літаральна пяць гадоў таму яны ўдзесяцёх жылі ў мінскай трохпакаёўцы...

ДАПАМОГА — ГЭТА ДАБРАВОЛЬНАЯ МІСІЯ

— Калі ў нас было трое дзетак: Ангеліна, Валера і Руслан, мы жылі ў зусім маленькай кватэры, — распавядае маці-гераіня. — З цягам часу як шматдзетная сям'я пабудавалі трохпакаёўку, і нам здалося, што там занадта шмат месца — вырашылі ўзяць яшчэ дзіця. Першымі прыёмнымі дзецьмі якраз пасля Новага года сталі 3-гадовая Ганначка і яе гадавалы брат Жэня. Пасля з'явіўся 13-гадовы Валік. Праз нейкі час я даведалася, што ў доме дзіцяці ёсць маленькі хлопчык. Я доўгі час наведвала яго ў бальніцы, — так у нас з'явіўся 7-месячны Ігар, а праз год — 2-месячная Кіра, яго сястрычка. Тры гады назад абое малыя сталі нашымі роднымі дзецьмі. Затым у сям'ю прыйшлі 7-класніца Ганна і яе брат першакласнік Сяргей. Пасля з'явілася Марта, а ў канцы мінулага навучальнага года — Света і Таня.

Далейшы лёс сям'і склаўся так, што пляменнік Любові трапіў у прытулак. Хлопчык вельмі хацеў жыць з цёткай, але ж забраць яго адзінаццатым у кватэру было немагчыма ўжо проста фізічна. Якраз на той момант была створана дзіцячая вёска «Вытокі» ў Бараўлянах, і прыёмныя бацькі сталі там бацькамі-выхавальнікамі, забраўшы да сябе 14-гадовага пляменніка Уладзіка.

— Я вельмі люблю дзяцей. Мне шкада, калі яны апынаюцца ва ўмовах, што іх няма каму абараніць. Была б у мяне магчымасць, я ўсынавіла б усіх сваіх дзяцей, — расказала Любоў. — Усе яны ведаюць, што любоў не вымяраецца запісам у пашпарце, яны проста адчуваюць яе кожны дзень.

— Гэта яе місія, напэўна, — дапамагаць людзям, яна ўсіх шкадуе, — дадае галава вялікага сямейства Дзмітрый Чагін.

Магчыма, такое жаданне дапамагаць сфарміравалася ў жанчыны яшчэ ў дзяцінстве. Хаця ў сям'і яе бацькоў было толькі двое дзетак (яна ды брат), доўгі час там знаходзілася стрыечная сястра Надзея, якая засталася без маці ў 16 гадоў.

— У мяне заўжды перад вачыма быў прыклад, што ёсць чалавек, якому патрабуецца дапамога, магчыма, таму я і прывыкла дапамагаць, — разважае Любоў Мікалаеўна. — Адносіны ў маёй уласнай сям'і будуюцца выключна на ўзаемнай павазе. Амаль усе дзеці называюць мяне мама, акрамя Тані і Светы, якія яшчэ не прывыклі да мяне з мужам. Шмат хто сустракаецца са сваімі роднымі бацькамі, сазвоньваецца з імі па тэлефоне. Мне так цікава чуць, як яны кажуць: «Мама, ты прыедзеш? Мне мама сказала, што цябе чакае».

БАЦЬКА І МАЦІ Ў ВАЧАХ ДЗІЦЯЦІ

У вольны час дзеці любяць глядзець кіно, гуляць у настольныя гульні, спяваць у караоке.

Ганна любіць чытаць. Ангеліна вучыцца іграць на гітары, займаецца плаваннем, тэнісам, пачынала прафесійна займацца акрабатыкай, на ўсіх спаборніцтвах бегае за клас. Света добра малюе. Валера пляце з бісеру, танцуе брэйкданс. Руслан займаецца паркурам, спартыўным арыентаваннем. Марта вяжа кручком і робіць шмат сваімі рукамі.

Старэйшыя дзяўчаты ўжо паціху трэніруюць малых. Кіра як сапраўдная гімнастка дэманструе мне расцяжку ў шпагаце, а Ігар цудоўна малюе гуашшу.

— Самы вялікі аматар спеваў — мама, — выдае сакрэт Ангеліна. — Яна таксама добра шые і вяжа. На ўсе навагоднія ранішнікі стварае касцюмы сама, Ігар вось быў у мінулым годзе астролагам. Кіры нядаўна звязала кофту, а тата атрымаў цёплыя шкарпэткі.

— Тата вельмі добра і смачна гатуе. Яго каронная страва — плоў, які я вельмі хачу навучыцца гатаваць, — дзеліцца Ганна. — У мамы — гэта тварожныя пончыкі. І ўсе мы, хто старэйшы, умеем гатаваць мяса па-французску, мама навучыла.

Гатуюць, прыбіраюцца і адпачываюць Чагіны ўсе разам. У кожнага за сталом сваё месца.

— Мы гатуем у звычайных 6-літровых каструлях. Усё з'ядаецца адразу, назаўтра гатуецца новае. Мне вельмі дапамагаюць дзяўчаты, таму я не адчуваю, што аддаю кухні шмат часу. Яны ўсё ўмеюць: бліны смажаць, курыцу запякаюць, суп вараць. Руслан, які цяпер вучыцца ў БНТУ і жыве ў інтэрнаце, мне звоніць і пытаецца: «Мама, я не разумею, як мне гатаваць на аднаго? Колькі солі трэба і вады, каб макароны зварыць?» — смяецца Любоў Мікалаеўна.

МАРСКІЯ ПРЫГОДЫ

Калі Чагіны кудысьці выязджаюць на адпачынак, стараюцца рабіць гэта ўсёй сям'ёй — проста ездзяць у два рэйсы.

— Прыязджаем мы, напрыклад, на Мінскае мора, з вады толькі і чуваць: «Мама, я тут!», «Мама, паглядзі, куды я заплыў!». І калі так крычаць усе па парадку, то іншыя адпачывальнікі пачынаюць азірацца, дзе ж тая мама, у якой столькі плыўцоў, — дзеліцца гісторыямі Любоў.

Маці-гераіня вельмі баіцца вады, таму перажывае, каб дзеці не адплывалі далёка. На адпачынку ў Сочы ў 2008 годзе здарыўся выпадак, які стаў для яе сапраўдным шокам.

— Мы адправіліся ў марское падарожжа на катары з Ангелінай і Русланам. Спыніліся пасярод мора, дзецям раздалі камізэлькі і прапанавалі паплаваць. І мае дзеці, не пытаючыся нічога, нацягнулі гэтыя камізэлькі і ўскочылі ў ваду. Я сама не ўмею плаваць, і была ў такой істэрыцы, што проста пачала крычаць, як убачыла гэта. А яны мне з вады адказваюць: «Мама, нам камізэлькі перашкаджаюць плаваць. Можна мы іх здымем?» Да берага вярталіся яны на надзьмутым крузе, які быў прычэплены да катара. У выніку дзеці адпачылі, а мама ледзьве не захварэла, — успамінае Любоў, якая цяпер успрымае гэта ўжо як жарт. З часам яна прызвычаілася, што ўсе яе дзеці рухавыя, смелыя і няўрымслівыя і з гэтым трэба проста мірыцца.

Валік цяпер жыве самастойна, але прыязджае да бацькоў на ўсе святы і выхадныя. Маці Ганны і Сяргея праз 1,5 года пасля пазбаўлення яе бацькоўскіх правоў, выправілася і аднавіла свой статус, нарадзіла яшчэ адну дзяўчынку. Хлопчык зараз жыве з ёю. 16-гадовая Ганна, якой на той момант было 14 гадоў, вырашыла застацца з новай маці. З абедзьвюма ў яе добрыя адносіны.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара

■

СПАЧАТКУ БЫЛА... МАМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Святлана ШУТАВА, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз журналістаў»:

— За ўсё, што ёсць ува мне добрага, я ўдзячна сваёй маці — Валянціне Іванаўне Высоцкай. Яна для мяне настаўніца ва ўсім. Менавіта яна навучыла мяне чытаць. Нават памятаю першае слова, якое я самастойна прачытала, — «барабан». Яно было даволі складаным для такой маленькай, як я, але ж скарылася. І мне было вельмі радасна ад гэтай перамогі.

Маці заўсёды з'яўлялася для мяне прыкладам самаахвярнасці і таго, як трэба любіць бліжняга свайго. Ад яе вучылася паважаць старэйшых. Ніколі не бачыла, каб яна проста ляжала на канапе і нічога не рабіла. Працавала і мне нагадвала, што без працы нічога не атрымаецца. Таму з дзяцінства я ўсвядоміла: бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Калі хочаш чагосьці дасягнуць у жыцці, трэба працаваць. Маці і сёння, нягледзячы на ўзрост, ні хвіліны не сядзіць на месцы

Мама заўсёды была і ёсць для мяне аўтарытэт.

Наталля АЎДЗЕЕВА, старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры:

— Невыпадкова кажуць, што мы родам з дзяцінства: з малаком маці ўбіраем у сябе адносіны да навакольнага свету, асэнсоўваючы напачатку сябе неад'емнай часткай Мамы. У маім жыцці гэта было і (дзякуй Богу) ёсць да гэтага часу менавіта так. Мая матуля Жаннета Іванаўна Сільчанка вырасла ў беднай сям'і. Вучылася і працавала — за пяцярых! У выніку ад фабрычна-заводскай дзяўчынкі паднялася да высокай пасады аднаго з самых прэстыжных банкаў краіны. Пры гэтым ніколі «не хварэла» на снабізм, пры ўсёй патрабавальнасці да сябе і людзей.

А якая яна сярод сяброў і родных! Цудоўна спявае, мае тонкае пачуццё гумару... Нас з сястрой гэтаму вучыла, умудралася па вечарах і выхадных ладзіць у родным завулку на Чапаеўцы (ускраіна Магілёва) спартыўныя баталіі... І заўсёды паважала ў кожным з нас асобу.

Добрага здароўя табе, мамачка! Добрага здароўя ўсім-усім матулям! І светлая памяць тым з іх, хто ўжо глядзіць на сваіх дзяцей з Нябёсаў.

Сяргей ЛАГУЦЕНКА, мастацкі кіраўнік Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, акцёр:

— Маці для мяне — як вера. Пра яе таксама нельга гучна размаўляць. Калі бегаць і крычаць, як ты верыш, цябе западозраць ці ў хлусні, ці ў фальшы. Не словы, а ўчынкі вызначаюць нашы адносіны, у тым ліку да матулі. Тое, што я раблю, — гэта дзеля мамы.

Памятаю, у дзяцінстве мы ехалі ў вёску ў машыне з будкай. Раптам пачаўся лівень, навальніца і вельмі моцны вецер. Машыну гайдала, і фанерку ў акенцы выбіла ветрам. Маці тады стала і сваім целам увесь час закрывала гэтую адтуліну, каб нас з братам абараніць ад стыхіі.

Маці заўсёды хацела, каб у мяне была вышэйшая адукацыя. Але казала: можаш быць кім заўгодна, галоўнае — каб чалавекам нармальным.

Аляксей СКАКУН, старшыня СВК «Астрамечава» Брэсцкага раёна, доктар эканамічных навук:

— Мая мама Вера Пракопаўна выхоўвала нас найперш сваім прыкладам: яна заўсёды шмат працавала. Пасля вайны жылося цяжка, і, каб пракарміць сям'ю, вясковаму жыхару трэба было шчыраваць у полі ад цямна да цямна. Памятаю, мама жала жыта, а я зусім малым дапамагаў вязаць снапы. Потым паступова асвоіў усе тонкасці мужчынскай працы: касьбы, ворыва, малацьбы. Праз шмат гадоў, калі абазначыліся пэўныя поспехі ў рабоце і мяне сталі заўважаць, са мной лічыцца, прыйшло ўсведамленне, што падмурак гэтаму закладзены мамай.

Сяргей КАЛЯДА, намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» (Гродна):

— Мама, выкладчыца замежнай мовы, была маім класным кіраўніком. Яна ж аддала мяне ў музычную школу. Займаўся на класе баяна. Аднак усё часцей у чахле замест музычнага інструмента сталі аказвацца... кеды і мяч. А пазней мной моцна авалодала цяга да турыстычных вандровак. Пэўна, маме гэта не надта падабалася, даводзілася шмат чуць, што на першым месцы павінна быць вучоба. Але ўсё ж яна паказала прыклад павагі да мяне як асобы. Па сёння захоўваю маміна разважанне на кавалку паперы: «Чаму мой сын ходзіць у горы? Напэўна, хоча перамагчы сябе ў першую чаргу».

Аляксандр МАХАНЬКОЎ, акцёр віцебскага «Беларускага тэатра «Лялька»:

— Маёй маці Марыі Міхайлаўне 80 гадоў. Зараз яна жыве ў Багушэўску (гарадскі пасёлак у Сенненскім раёне. — **Аўт.**). А раней жыла ў гарадку Барань Аршанскага раёна. Там працавала на заводзе ў аддзеле тэхнічнага кантролю. Мужчыны рабілі дэталі, а яна якасць прадукцыі правярала. Мой старэйшы брат жыве далёка, а я, калі ёсць магчымасць, наведваю маму.

Наконт урокаў, якія я атрымаў ад мамы... Ды ўсяму яна мяне навучыла! Напрыклад, хадзіць у лес у грыбы і ягады. Калі яна кухарыла і трэба было ёй дапамагчы, гэта было весела. Усё рабіла яна лёгка, і побач з ёй заўсёды нешта рабіць было прыемна. Пры гэтым яна ўмела мяне падхвальваць. І ў выніку гэта спрыяла таму, што ўсё хацелася рабіць лепей.

Віктар ШНІП, паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

Кожны вечар перад сном, а потым раніцай, збіраючыся на працу, гляджу, як на абразы, на партрэты бацькоў, што вісяць у маім пакоі. У мяне нядаўна напісаўся верш:

Тата і мама глядзяць на мяне
З рамак партрэтных на хатняй сцяне.
Тата і мама — іконы мае.
Вас мне жывых, як святла, нестае
Тут на зямлі, дзе заўсёды святло
Нават у тым, што ў нябыт адышло...

У мяне шмат вершаў пра маму. На жаль, я іх напісаў, калі яе не стала. Цяпер для мяне дзень нараджэння мамы — гэта і мой дзень нараджэння, бо з нараджэннем маці нараджаемся і мы, яе дзеці. Беражыце сваіх МАТУЛЬ!

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Святлана ЯСКЕВІЧ.
Барыс ПРАКОПЧЫК.
Дзіяна СЕРАДЗЮК.